**УДК 398.33:582(=161.3)(476.5)“18/19”**

# ДЗІКАРОСЛЫЯ РАСЛІНЫ Ў КАЛЯНДАРНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ КАНЦА XIX–XX стст.

***Я.С. ШАЎЧЭНКА***
**Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск**

*Дзікарослыя расліны здаўна выступалі важным элементам каляндарнай абраднасці. Уяўленні аб іх складваліся на працягу многіх стагоддзяў, знаходзячы сваё ўвасабленне ў шматлікіх рытуалах і абрадах гадавога календара. Дзякуючы дыяхроннай перадачы ведаў, яны маюць праекцыю і ў сучаснай калектыўнай памяці беларусаў. Аналізуюцца традыцыйныя ўяўленні беларусаў Падзвіння аб дзікарослых раслінах у каляндарнай абраднасці гадавога цыклу канца XIX–XX стст. На падставе матэрыялаў палявых даследаванняў аўтара і пісьмовых крыніц характарызуецца ўвасабленне агульнараспаўсюджаных і лакальных народных уяўленняў у абрадах.*

Падзвінне як адзін з шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, якія складваліся на працягу стагоддзяў, займае большую частку Віцебскай вобласці і адпавядае асноўнаму масіву старажытнай Полацкай зямлі, дзе жылі полацкія крывічы. Ад іншых рэгіёнаў ён адрозніваецца сваёй унікальнасцю, што праяўляецца ў розных аспектах традыцыйнай культуры, у тым ліку і ў народных уяўленнях. Спецыфіка, характэрная для культуры беларусаў Падзвіння, абумоўліваецца асаблівым геаграфічным становішчам рэгіёна: наяўнасцю мяжы са Смаленшчынай і Пскоўшчынай на ўсходзе і латвійскімі землямі на захадзе, што забяспечвае адкрытасць тэрыторыі да міжэтнічных этнакультурных кантактаў. Гаворачы пра традыцыйныя ўяўленні беларусаў Падзвіння аб дзікарослых раслінах, нельга абдзяліць ўвагай і важнейшы прыродна-кліматычны фактар. Тэрыторыя характарызуецца больш суровым кліматам у параўнанні з паўднёвымі абласцямі Беларусі, а таксама наяўнасцю дзярнова-падзолістых суглінiстых глебаў, што ў пэўнай ступені сказваецца на перавазе адных відаў раслін над іншымі ў межах рэгіёну.

Вывучэнне народных уяўленняў беларусаў аб дзікарослых раслінах у межах Падзвіння з’яўляецца важнай часткай традыцыйнай культуры, актуальнай па сённяшні дзень. Дзікарослыя расліны здаўна выступалі важным элементам каляндарнай і сямейнай абраднасці. Уяўленні аб іх складваліся на працягу многіх стагоддзяў, пачынаючы з перыяду панавання збіральніцтва ў якасці асноўнага занятку людзей. Веды аб іх назапашваліся продкамі доўгі час, знаходзячы сваё ўвасабленне ў шматлікіх рытуалах і абрадах гадавога календара, звязаных з раслінамі, і трансліраваліся з пакалення ў пакаленне. Дзякуючы дыяхроннай перадачы ведаў, яны маюць праекцыю і ў сучаснай калектыўнай памяці беларусаў Падзвіння.

**Зімовы цыкл**. Выкарыстанне дзікарослых раслін у зімовым цыкле календара беларусаў заканамерна абумоўлівалася прыродна-кліматычнымі ўмовамі і станам флоры ў дадзены перыяд, для якога характэрна адсутнасць разнастайнасці раслін. Важнейшымі часавымі кропкамі, да якіх прымяркоўвалася каляндарная абраднасць зімовага цыклу, былі *Каляды і Хрышчэнне (Вадохрышча).* Заканамерна, што большая частка народных уяўленняў каляднага абрадавага цыклу звязвалася з вечназялёнай *елкай (ялінай).*

На Падзвінні, як і на іншых тэрыторыях Беларусі, агульнараспаўсюджаным з’яўляўся абавязковы звычай ставіць у хаце ўпрыгожаную елку на *Каляды*. Маленькую яліну ставілі і ўпрыгожвалі нават і тыя гаспадары, у якіх у двары расло вялікае дрэва [1, л. 4]. У традыцыйнай культуры яліне ўласціва амбівалентная сімволіка: яна надзялялася супрацьлеглымі характарыстыкамі і магла разглядацца як пазітыўнае дрэва (што і прасочваецца ў каляднай абраднасці), так і негатыўнае. Паводле хрысціянскай традыцыі, яліна лічылася “свянцонай” – па легендзе дрэва само апускала галлё, дапамагаючы Божай Маці хаваць маленькага Хрыста ад слуг Ірада. Нібыта за гэта бог асвяціў дрэва і загадаў заўжды ставіць яго ў хаце і закладаць за абразы на Каляды [2, с. 159]. Пра сакральны статус яліны сведчыць яе апатрапейная функцыя – галінкі дрэва закладалі за абразы, каб абараніць жыхароў хаты ад нячыстай сілы і розных шкодных уздзеянняў. Абарончая функцыя яліны выразна карэлюецца са знешнім выглядам дрэва і яго якасцямі: наяўнасцю вострых іголак (“колкасць”, “вастрыня”), смалістым пахам, крыжовым тыпам росту лапак і г.д. Пад уплывам хрысціянства для павелічэння абарончых уласцівасцей яловыя галіны асвячалі ў храме непасрэдна на Каляды.

Апатрапейная сіла яловых лапак па традыцыі ўзмацнялася і на *Вадохрышча:* імі часта абтыкалі палонку для асвячэння вады: “Як на Вадохрышчэ свецяць на Ярдані воду, та кругом ставяць маладыя ялінкі, каб закрыць ваду ад усялякае нечысці, каторая, спужаўшыса, можа напашкудзіць” [3, с. 287]. Яловыя галіны таксама ўторквалі ў страху хаты дзеля засцярогі ад Перуна.

У сучаснай традыцыі на Падзвінні аўтарам зафіксавана выкарыстанне яловых лапак ад бяссоніцы – галіны клалі пад падушку, што спрыяла хуткаму надыходу сну. [1, л. 4] Падобны матыў можа тлумачыцца своеасаблівым статусам каляднага дрэва і яго медыятыўнай функцыяй.



Polotsk.edu

У фальклоры каляднага цыклу часта ўзгадваюцца і сезонныя лістападныя дрэвы, такія як *каліна*, *груша*, *явар* і г.д. Хаця яны і не выкарыстоўваліся непасрэдна ў абрадах зімовага цыклу, іх сімволіка ў першую чаргу звязвалася з вясельнай абраднасцю, што адпавядае ўсходнеславянскай традыцыі спраўляць большасць вяселляў у зімовы перыяд. *Груша* ў калядных песнях, як правіла, сімвалізавала дзяўчыну шлюбнага ўзросту, гатовую ісці замуж: “А ўжо йгруша дазрела, // А я малада. // А ўжо грушу пара тресть, // А я малада…” [4, с. 24] *Каліна*, у сваю чаргу, выступала ўвасабленнем дзяўчыны ў пераходны перыяд да стану жанчыны; акрамя таго, яна сімвалізавала нешчаслівую жаночую долю: “Трудна мне, трудна мне // Калініцу скусти, – // Трудней таго й нету – // За стареньким жити” [4, с. 50].

**Вясновы цыкл.** Вясновы цыкл календара адкрывае свята *Дабравешчання*, на якое прыпадае пачатак актыўнага прабуджэння раслiннасці ад зімовага сну. М. Нікіфароўскім у канцы XIX ст. на Віцебскім Падзвінні было зафіксавана павер’е пра *арэхавы куст*, які цвіце ўначы толькі на Дабравешчанне. Існавала ўяўленне пра тое, што арэх прыносіць шчасце і надзяляе чалавека здольнасцю знаходзіць скарбы ў купальскую ноч таму, хто здолее сарваць першую кветку з куста [5, с. 128]. Як сведчаць этнаграфічныя дазеныя, у сучаснасці звесткі аб падобных уяўленнях, на жаль, не сустракаліся.

Комплекс традыцыйных уяўленняў звязаны з *Вербнай Нядзеляй (Вербніца)*, якая папярэднічала Вялікадню. Асноўным элементам велікоднай абраднасці беларусаў Падзвіння ў кантэксце агульнабеларускай традыцыі выступала *вярба*, што ва ўсходніх славян адпавядала біблейскай пальмавай галіне. Украінскі даследчык К.Ю. Рахно лічыць, што выкарыстанне галінак вербы – з’ява больш старажытная за хрысціянства, адпаведна рытуальна-магічны характар дрэва замацаваўся яшчэ ў дахрысціянскія часы [6, с. 307]. Вярбе ўласціва апатрапейная функцыя, што зыходзіла з народных уяўленняў пра яе надзвычайную моц. Па народных павер’ях нячыстая сіла, якая з Вадохрышча і да Вербніцы сядзіць на вярбе, звальваецца ў ваду пасля таго, як галінкі асвячаюць у цэрквах [7].

К. Рахно выдзяляе дзве формы выкарыстання славянамі вярбы ў апатрапейнай перспектыве – доўгачасовую і сітуатыўную [6, с. 306]. Доўгачасовая форма заключалася ў выкарыстанні вярбы ў якасці апатрапея ад рознай небяспекі на працягу ўсяго года. Да свята сяляне рыхтаваліся загадзя – вярбу ставілі ў ваду, каб яна распусцілася, потым да яе дадавалі ядловец “ад усякага зглазу”, часам упрыгожвалі кампазіцыю папяровымі кветкамі ці стужкамі [8, с. 88]. Асвячалі галіны ў царкве, уторкнуўшы ў іх свечку [9, л. 30]. Згодна ўяўленняў жыхароў Полаччыны, асвячэнне вярбы напрамую мела сувязь з будучым ураджаем, як бы праграмавала яго: “Вярбу свецяць, каб жыта ішло такое высокае і чыстае, як вярба” [8, с. 88].

Трэба адзначыць, што галінкі вярбы сяляне выкарыстоўвалі практычна ва ўсіх сферах жыцця: для абароны хаты, гаспадаркі і саміх гаспадароў ад негатыўнага ўздзеяння. З гэтай мэтай асвечанымі галінкамі тройчы сцябалі па спіне дамачадцаў, што, на іх погляд, павінна было спрыяць здароўю. “Біццё” часта суправаджалася прыгаворамі. Месцамі традыцыя бытуе і зараз. У традыцыйных прыгаворах Падзвіння фігуруюць шматлікія азначэнні вярбы. Да прыкладу, у Докшыцкім і Глыбоцкім раёнах у прыгаворах сваёй спецыфікай вылучаліся ўяўленні пра г. зв. “белую” і “красную” вярбу (“…ёсць жа красненькая вербінка, а ёсць белая”): “Верба бела б’е за дзела, верба красна б’е напрасна!”[1]. У Гарадоцкім раёне сустракаем азначэнне і “сіняй” вярбы: “Верба крёст – сякець да слёз, верба бела сякець за дзела, верба сіня б’ець па спіне” [8, с. 88].

Прымячальна, што вербныя прыгаворы сярод каталікоў Падзвіння адрозніваліся значным рэлігійным уплывам у параўнанні з праваслаўнымі, дзе архаічныя элементы прыгавораў захаваліся ў большай ступені: “Верба б’е не заб’е, за тыдзень Вялікдзень, за сем ноц Вельканоц” [10, л. 54].

Асвечаныя галіны дрэва па традыцыі амаль паўсюдна ўторквалі за іконы і вуглы хаты або ў страху хаты “каб не знесла” (Полацкі, Докшыцкі, Глыбоцкі, Шумілінскі і інш. раёны) [10, л. 21]. На Браслаўшчыне свянцоная вярба лічылася надзейным сродкам ад пажару [1]. Ставілі галінкі і на вакно, дзе вярба таксама выконвала функцыю грамаадвода: “Каб пярун не даў і град не пабіў” [9, л. 10]. Прымячальна, што беларусы-каталікі Падзвіння здольнасць вярбе адводзіць грымоты прадпісвалі ў значна меншай ступені, чым праваслаўныя: “Ну гэта хто як, па каждаму. Такога стандарта не было”[10, л. 54].

Сітуатыўная форма выкарыстання вярбы праяўлялася ў яе ўжыванні ў небяспечнай сітуацыі – лячэнні хвароб дамачадцаў і жывёлы шляхам абкурвання і г.д. Для лячэння ўжывалі таксама свянцоную вярбу разам з *ядлоўцам* – заварвалі і давалі піць хвораму [8, с. 88].

У канцы XIX – пачатку XX ст., побач з аналагічнай заходнепалескай традыцыяй, у Полацкім і Віцебскім паветах М. Нікіфароўскім была адзначана традыцыя наведваць на Вербніцу могілкі і ўторкваць у іх галінкі вярбы. Рытуальныя дзеянні, якімі суправаджалася наведванне, уключалі ў сябе сцябанне магілы вярбой (3 разы) і вуснае вітанне з нябожчыкамі [5, с. 16–17]. На сённяшні дзень традыцыя сустракаецца ў асобных частках Падзвіння. У Докшыцкім раёне зафіксавана адзначэнне Вербных Дзядоў перад Вербніцай, хаця могілкі ў гэты дзень не наведваюць [11, с. 48]. У цэлым на большай частцы Падзвіння традыцыя на сённяшні дзень практычна не фіксуецца.

*На Вялікдзень* вярба працягвала выковаць функцыю галоўнага абрадавага дрэва, упрыгожваючы велікодны стол селяніна. Найбольш часта вярба выкарыстоўвалася ў абрадзе першага выгана скаціны ў поле (на Падзвінні – "*запасванне*") на *св. Юр'я*. Правядзенне абраду першага выгана скаціны ў поле, на думку селяніна, павінна было гарантаваць яе бяспеку ад нападу дзікіх звяроў і садзейнічаць паспяховаму вяртанню дадому. Суправаджаўся абрад спецыфічнымі загаворамі кшталту: "Верба-лёс, бі да слёз, верба б'е, я ня б'ю, сігай ў лес, у хіры лес, у хіры цёмны лес…" і г.д. [1, л. 7]. Вярбу на Падзвінні выкарыстоўвалі разам з яйкам як асноўным рытуальным прадметам, што павінна было забяспечыць дабрабыт пагалоўя ската і гаспадаркі на ўвесь сезон. На Глыбоччыне папярэдні свята клалі яйка пад парог, выганяючы скаціну на пашу вярбой, а потым па вяртанні пакідалі галінкі ў хляве: "Вербіну ўзяць у рукі, а даўней хто стары і яйцо клалі пад парог…гэтай вербінай аж на пасту загоніш і прыносілі ў хлеў торкалі" [9, л. 17].

Спецыфічныя рысы правядзення абраду "запасвання" з ужываннем пэўных відаў дзікарослай расліннасці на Падзвінні вылучаюцца і ў межах самаго рэгіёна. У Міёрскім раёне, напрыклад, разам з вярбой выкарыстоўвалі і мінулагоднія *купальскія зёлкі*, якімі падкурвалі падчас правядзення абраду: "А тады хазяйка ззадзі нясець кацялочкі, там жару насыпана і святой травы" [8, с. 89]. У Пастаўскім раёне карова праходзіла цераз парог, у які папярэдне забівалі *асінавы кол*, што абараняла яе ад уздзеяння чараўнікоў, а ў Гарадоцкім раёне акрамя гэтага жывёлу сцябалі распараным *бярозавым* венікам і абсыпалі *макам*. На Полаччыне падчас выгану жывёлу абкурвалі вярбой і зёлкамі, а таксама *ядлоўцам і дзівасілам*: "Дзівасілам асобенна кладуць, гаворацъ, дванаццаць сіл у ім" [8, с. 104].

Пасля запасвання вербную галіну па традыцыі прыносілі назад у хату або ў хлеў – сімвалічна праграмавалі вяртанне жывёлы дадому і папярэджвалі выкарыстанне галіны ведзьмамі з мэтай нанесці шкоду. У М. Нікіфароўскага сустракаюцца звесткі аб падзвінскай традыцыі разламваць пасля вяртання з поля вербную галінку на столькі частак, колькі пасвілася жывёл у статку, пасля чаго гэтыя часткі кідалі ў хлеў (каб скаціна не ўцякала). Падобны рытуал, у сваю чаргу, быў зафіксаваны і П. Шэйнам на Гродзеншчыне і Берасцейшчыне: "Як первый раз выгоняеш скотыну, трэба пошчытаты, кулько штук там е, и тулько кусочков тэи вэрбы свячоной поломаты и кинуты ў хлиў – то будуць заходыты ў хлиў" [12, с. 133].

Паказальнай для Падзвіння з'яўляецца традыцыя выкарыстання на Юр'я вярбы ў абрадах земляробчага цыклу, што былі накіраваны на забеспячэнне ўрадлівасці глебы на ўвесь бягучы год. Вярбу ўторквалі ў зямлю падчас ранішняга абыходу нівы: "На Юр'я вербіну гэту ў жыта становіш" (Глыбоцкі раён) [9, л. 21]. У Шумілінскім раёне рытуальнае выкарыстанне вярбы падобным чынам інфарматары тлумачылі тым, што дрэва нібыта перадае сваю "святасць" зямлі: "Як удзень ідуць на поле, і галінку гэту торкаюць у зямлю…каб зямля святая была" [9, л.15]. На думку А. Шлюбскага, дадзены абрад стымуляваў рост збажыны, што падцвярджаюць мясцовыя прыгаворы: "Жыта, расці, як вярба, высокае, чыстае расці" (Полацкі р-н) [8 с. 106].

Абрад, падобны да вышэй адзначанага, сустракаўся ў другой палове XIX ст. і ў іншых рэгіёнах. Так, на Панямонні на св. Юр'я гаспадары абыходзілі свае палі і ўторквалі вярбу ў зямлю ад граду [13, с. 173]. На Падзвінні і сёння вярбу асобныя ставяць у гародах "ад буры, ад усяго" [8, с. 107].

Разнастайнасцю вылучаюцца традыцыйныя ўяўленні беларусаў Падзвіння аб дзікарослых раслінах у межах свята *Троіцы* (на Падзвінні – *"Духа"*, *"Сёмуха"*, *"Зялёныя святкі"* і г.д.), якое звязана з перыядам біялагічнага росквіту расліннага свету. Зяляніна з'яўляецца асноўным элементам траецкай абраднасці на Падзвінні, як і на ўсёй тэрыторыі Беларусі, хаця мае і свае асаблівасці.

У параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны, на Падзвінні ў суботу, за тыдзень да Троіцы, з асаблівай урачыстасцю святкаваліся Траецкія Дзяды (перыядычна сустракаецца назва *Стаўроўскія Дзяды*). Зяляніна ("май") ў гэты дзень шырока выкарыстоўвалася яшчэ на этапе падрыхтоўкі да наведвання могілак. Да прыкладу, у Расонскім і Гарадоцкім раёнах фарбавалі яйкі *бярозавым* лісцем, праз якое яны набывалі спецыфічны жоўты колер: "Яйкі красілі бярёзавым лістом ілі травой. Яны жоўценкія палучаюцца такія" [8, с. 110]. На Расоншчыне ў в. Янкавічы бярозай падчас наведвання хрысцілі магілку, а потым уторквалі галіну ў яе. У Верхнядвінскім раёне жанчыны прыбіралі могілкі бярозавымі венікамі [11, с. 51].

На Пскоўшчыне захаваўся своеасаблівы памінальны звычай: пры наведванні могілак іх "апахвалі" (абмяталі) пучком бярозавых галін і кветак – верылі, што гэта прыносіць радасць памерлым [14, с. 447]. У беларусаў Себежчыны, якая ў мінулым уваходзіла ў склад Беларусі, у сваю чаргу, зафіксавана традыцыя "сцябаць" магілы бярозавым веццем [11, с. 51]. Дадзеная традыцыя, як вынікае з вышэй адзначанага, узнікла ў беларускага насельніцтва як вынік этнакультурнага ўплыву.

Як і паўсюль на Беларусі, на Падзвінні ў Траецкую суботу зелянінай упрыгожвалі сялянскія двары звонку і знутры. Падлогу хаты засцілалі *аерам (яварам)*, якому ў траецкай абраднасці адзводзілася асобнае месца: "Ваер во ў мяне вісіць. Дык ён пахнець, такі пахнючы, мы яго ў хаце астаўлялі, ну, гэта ўсё падбіралі і палілі" [9, л. 49]. У асобных мясцінах зрэзаны аер кідалі прама на парозе хаты ў якасці абярэга ад нячыстай сілы [1, с. 28]. Уяўленні пра апатрапейныя функцыі аера мелі пад сабой рацыянальную аснову, заснаваную на яго біялагічных уласцівасцях адпужваць насякомых. Да прыкладу, на Троіцу аерам пасыпалі падлогу, бо "аір не дает росту блохам" [15, с. 65].

Выкарыстанне розных відаў раслін характарызавалася разнастайнасцю ўнутры самога рэгіёна. У паўночных і заходніх раёнах Падзвіння асноўным рытуальным дрэвам з'яўлалася бяроза, з якой рабілі вянок – бярозавы "май": "На Троіцу стаўлюць май, і пад паталок вешаюць. І стаіць гэты май ад Троіцы і да Купалы" [19, л. 5]. Бярозавыя вянкі надзяляліся лекавымі і апатрапейнымі функцыямі і выкарыстоўваліся ў якасці абярэга. Галіны бярозы клалі за іконы, уторквалі ў патэнцыйна небяспечныя месцы ў хаце (столь, дзверы, вокны і г.д.). У Полацкім раёне "май" ставілі і на ростанях, каля крыжа [8, с. 111].

У паўднева-ўсходняй частцы рэгіёна "май" ставілі з галін розных дрэў: акрамя бярозы выкарыстоўвалі дуб, клён, ліпу, рабіну і г.д. Да прыкладу, у Лёзненскім раёне выкарыстоўваліся адразу ўсё вышэй пералічаныя дрэвы: "Абізацельна ставілі бярёзу, клён, ліпу, у хаці пад балькі торкалі веткі кожнага дзереўца. Сякуць бярозы бальшыя і дзелаюць такія як вароты" [8, с. 111]. У гэтым жа раёне фігуравала павер'е: калі ў Чысты чацвер зрабіць ванну з "маем" і выкупацца ў ёй, тады "цэлы год чысты чалавек не балеець ніякей балезню" [8, с. 111]. Падобныя ўяўленні адлюстроўваюць павер'е аб лекавых уласцівасцях "мая", якія былі ўласцівыя беларусам і ў іншых рэгіёнах. Пад уплывам хрысціянства агульнараспаўсюджаным з'яўляўся звычай асвячаць "май" у царкве, у тым ліку і на Падзвінні. У Докшыцкім і Шумілінскім раёнах існавала традыцыя асвячаць зеляніну на Дзевятнік (прысвятак перад Троіцай) [9, л. 42].

Вядома, што бярозавае дрэва ў беларускай традыцыі выступала ўвасабленнем жаночай сімволікі. Абрад "завівання бярозы" на Падзвінні быў прадстаўлены завіваннем вянкоў дзяўчатамі і траецкімі варожбамі. Гэтым Падзвінне адрозніваецца ад памежнай тэрыторыі Смаленшчыны, для якой характэрны больш поўны комплекс элементаў абраду: убіранне бярозы ў стужкі, хаджэнне з ёй па сялу і г.д. [17, с. 79].

Як і ў іншых мясцінах Беларусі, варожбы на Падзвінні мелі на мэце прадказанне будучыні і засноўваліся на апазіцыях "замужжа – адзінота" і "жыццё – смерць", адлюстроўваючы найбольш хвалюючыя пытанні чалавека. У Дубровенскім раёне дзяўчаты завівалі бярозавыя вянкі і пакідалі іх на тыдзень, а пасля глядзелі на вынік: "Чый вяночак праз нядзелю вясёлы – будзе жыць. А бывае і ссохнець – то тая дзяўчына памрэць" [8, с. 112]. На Пастаўшчыне вянок вешалі на дрэва і прымячалі, хто з хлопцаў зніме яго – той і будзе мужам.У Лёзненскім і Шаркаўшчынскім раёнах пускалі вянкі на ваду і глядзелі, у чый бок яны прыплывуць [8, с. 112].

Рытуальнае выкарыстанне траецкай зеляніны ў жывёлагадоўчай сферы зафіксавана на Падзвінні: у Лёзненскім раёне перад Троіцай завівалі вянкі на рогі каровам з бярозы, ліпы і клёна [8, с. 113]. Па павер'ях гэта забяспечвала жывёле здароўе і вялікія надоі [18, с. 43]. Магічны сэнс абрадаў траецкага цыклу з выкарыстаннем зеляніны заключаўся ў забеспячэнні дабрабыту сям'і, гаспадаркі і багатага ўраджаю на ўвесь будучы год.

**Летні цыкл.** Летні цыкл, з'яўляючыся адносна непрацяглым па часе ў параўнанні з іншымі цыкламі народнага календара, уключае ў сябе розгалінаваную сістэму традыцыйных уяўленняў аб дзікарослых раслінах. Большая частка дадзеных вераванняў спрадвеку звязваецца з перыядам летняга сонцастаяння у ноч з 23 на 24 чэрвеня (*Купалле, Ян,* на Расоншчыне – *Цвятны Іван*) [8, с. 148]. Менавіта летняе сонцастаянне выступае кульмінацыяй гадавога земляробчага кола, якое ўключае ў сябе яскравыя элементы старажытнага расліннага культу. Ушанаванне раслін з'яўляецца вызначальнай рысай купальскай абраднасці на Падзвінні, як і на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Расліны ў дадзены перыяд, на народны погляд, валодалі надзвычайнай сілай, што выразна адлюстроўвалася ў традыцыйных уяўленнях.

Усю сукупнасць дзікарослых раслін, што збіралі на Купалле, умоўна можна падзяліць на дзве катэгорыі: травы і кветкі, што назапашвалі дзяўчаты для пляцення сваіх вянкоў, а пасля для варажбы; і *зёлкі*, што збіраліся жанчынамі сталага ўзросту на ўвесь будучы год. Менавіта яны, па народных уяўленнях, дапамагалі пры лячэнні розных захворванняў, а таксама выступалі важнейшымі абярэгамі ад розных шкодных уздзеянняў.

Велізарнае значэнне народам надавалася часу збору траў на Купалле. У кантэксце агульнабеларускай традыцыі на Падзвінні часцей за ўсё іх пачыналі збіраць яшчэ напярэдадні свята, як правіла, у другой палове дня, і збіралі на працягу сутак. Тым не менш, у межах самога рэгіёна сустракаліся і варыяцыі. На Полаччыне, напрыклад, зёлкі стараліся сабраць да свята Купалля, каб яны "не згубілі сваю моц", а ў Чашніцкім раёне збіралі выключна на Купалле. Ва Ушацкім і Лепельскім раёнах найбольшую моц прыпісвалі раслінам, сабраным у маі, перад самай поўняй [18, с. 27]. У звычайныя дні, па-за межамі каляндарных святаў, дзікарослыя расліны з лекавымі і абарончымі ўласцівасцямі збіралі часцей на ўсё раніцай – на досвітку, пакуль яшчэ не сыйшла раса (па адказах 15 з 40 апытаных інфарматараў) [1].

Звычайна працэс збору раслін суправаджаўся песнямі: "А сягодня Ян, заўтра Іван. // Дзеўкі зёлкі збіралі і да цара слалі. // Цар зёлак не хацеў прыняць, цар зёлак не прыняў. // І да царыцы адаслаў, царыца зёлак не прыняла" [22, л. 28]. З распаўсюджаннем хрысціянства пачалі асвячаць зёлкі ў царкве, што, па павер'ях, дадавала ім моцы. На Падзвінні асвячалі ўсе сабраныя травы і кветкі, нават і тыя, што ў штодзённым жыцці лічыліся пустазеллем: "На Яна пасвяцалі ўсякія цвяты: і гароднія, і палявыя, і быльнік, і дажа ветачку, і палынь" [8, с. 149].



polotsk.su

Пэўныя дзікарослыя расліны збіралі часцей за астатнія, зыходзячы з іх лекавых уласцівасцей, якія, на народны погляд, узрасталі ў раслінах, сабраных у час свята. Адной з найбольш папулярных купальскіх раслін у рэгіёне была *півоня (“півонія”,“пілонія”)*, якую і дагэтуль узгадваюць у народнай традыцыі на Падзвінні. У Докшыцкім раёне, напрыклад, засушанымі кветкамі півоні абкурвалі хату – гэта лічылася надзейным абярэгам ад грому: “Асобенна вот гэтая пілонія, гэтая очэнь памагала. Вот гэтая пілонія, цвяточкі тыя, на дымок – і пасцілаць па крышы…” [23, л. 50]. Таксама зёлкамі півоні акурвалі малых дзяцей, што спужаліся, і давалі ім глытаць дым з зёлак: “Тады ж і з пуду, як дзеці спужаюцца, на вугалькі ложуць, натруць дзяцей. Биваець на скавародачку натруць зёлачкі, з іх дымок ідзець, дзецям тады кажуць: Ну, пераймай гэты дымок глытаць” [9, л. 53]. Падобнае сустракаем і ў Глыбоцкім раёне: “Півонію дзецям малым крэпка добра, півонія свянцоная, еслі свенцюць – гэта ад пужання дзецям” [10, л. 36]. Півоня дапамагала і ад сардэчных хваробаў: “Сэрца баліць – заварыць папіць” [10, л. 53]. Добрым сродкам ад упуду для дзяцей лічыўся і *дзядоўнік (“дзед”)*: “А тады дзеда калючага гэтага свянцалі. Тожа дзіцям ад упуду, паілі дзяцей” [9, с. 51].

*Крапіву (“крапіву-жгучку”, “жгучку”)* паўсюдна збіралі на Падзвінні як выдатны абярэг ад чараўнікоў і нячыстай сілы, якая станавілася надзвычай актыўнай у гэты час: “Была ў нас мода жучкай дзверы запіраць. Як помню, мне маці: “Ідзі за жучкай!” І я ёй дзверы выкладаў, кажуць ад чараўніка” [24, л. 12]. Крапіву разам з дзядоўнікам вешалі і на клямку дзвярэй, засцерагаючы ўваход у хату: “Жучка-крапіва і дзед такі калючы, чартапалох. Вешаюць на клямачку, і крапівіну, каб гэта ж, ну, чарадзей не ўзяў” [9, л. 5]. Ад шкоднага ўздзеяння ведзьмаў крапіву раскідвалі па ўсім двары, каб тыя не дабраліся да хлеву і не адбіралі ў кароў малако: “Гэта перад Купалам на Івана, хто умеець чараваць, тады на двор карову малако адбіралі. Я сама ўжо сюды замуж прыйшла, кажуць, як накідаеш гэтай жгучкі на двор, каб гэтае зло не падхадзіла к хлеву” [22, л. 28]. Апатрапейныя ўласцівасці крапівы відавочна зыходзілі з яе прыродных “абарончых” якасцяў, такіх як калючасць, пякучасць і г.д. Паказальным з’ўляецца зафіксаваны ў Міёрскім раёне звычай не асвячаць крапіву і дзядоўнік [8, с. 149], што падцвярджае асаблівы статус гэтых раслін.

У Дубровенкім раёне спецыяльна для скаціны збіралі траву *“брат-і-сястра” (мар’яннік, Іван-ды-Мар’я)* і давалі жывёле з’есці перад Купаллем – па павер’ях, яна абараняла яе ад рознай небяспекі і шкоднага ўздзеяння [8, с. 149]. У Верхнядзвінскім раёне, відавочна, аналагічная расліна носіць назву *“купальня”:* “Сам цвяток знізу сіненькі, а павярху ішчо і жоўценька”. У в. Каралёва дадзенага раёна захаваўся рэдкі купальскі абрад – з “купальняй” абыходзілі двары і аддавалі яе жывёле, атрымоўваючы за гэта ад гаспадыні сыр: “ Яе каровам нясуць ад порчы. Каждая хазяйка гатовіла сыр на купальню. Маладзёж сабіраецца, да і жэншчыны, нарвуць этай купалы і прынясуць у каждую хату. А хазяйка ім сыр дорыць. А еты цвяты як будта ўжо карове добра, аддаюць карове, вот так” [8, с. 150].

На Падзвінні ў Купальскую ноч таксама збіралі *мядзвежае вуха, мацярдушку*, а таксама *чабор*, якія пасля выкарыстоўвалі для лячэння хвароб: “Даўна было такое, мядзведзье вуха звалі. Такая во гэткая дудка, і гэткія жоўтыя жбаночкі, біваюць такія сінія, і дудка тоненькая. А цяпер няма іх, мацярдушка такая была і чанбор. Дык чанбор каля гэных хат напроць лесу. Дык чанбор п’юць, кажуць, ад почак дужа добра. А мацярдушка, у яе былі бурачковыя кввяткі. Ну вішнёвыя такія цёмныя гэтыя цвяточкі, цвет такі харошы, і ад сэрца” [23, л. 10].

Адной з найбольш распаўсюджаных купальскіх траў быў *святаяннік (святаянка, зверабой)*. Сама этымалогія паходжання слова *святаяннік* (св. Яна) адлюстроўвае сутнасць расліны, што дасягае росквіту і накоплівае свае карысныя якасці менавіта на Купалле. Акрамя таго, што святаяннік выкарыстоўвалі як абярэг ад нячыстай сілы, шырока вядомыя і яго лекавыя ўласцівасці. Да прыкладу, святаяннікам паспяхова лячылі бранхіяльную астму: “Зверабой гэта ў чай было добра, і для здароўя добра. Зверабой можа звярэй убіваць, вот эта я помню, а мы збіраем. А так…Жана была збірала. Яна хворая была – бранхіальная астма. І што ўрачы гаварылі, што людзі панімалі – яна збірала, яна знала. А я толька знаю зверабой. І ў чай паложыць, і яна п’ець чай” [1, с. 6].

Асвечаныя зёлкі выкарыстоўвалі на Падзвінні, як і паўсюль на тэрыторыі краіны, на працягу ўсяго года, да наступнага летняга сонцастаяння. Верылі ў іх апатрапейную сілу: абараняць гаспадароў і хату ад уздзеяння злых сіл, а таксама ў дапамогу ў лячэнні хвароб. Зёлкі побач з грамнічнай свечкай лічыліся добрым “граматводам” – іх ўторквалі на даху хаты, а падчас грому кідалі ў печ, каб адвесці небяспеку: “Як гром грыміць, свечку і зёлкі гэтыя ў каждага чалавека. Свянцаць і праносіць” [24, л. 51]. Купальскія зёлкі паўсюдна на Падзвінні выкарыстоўвалі ад буры (Шаркаўшчынскі, Дубровенскі, Докшыцкі, Глыбоцкі, Полацкі і інш. раёны) [8, с. 149].

З наступленнем новага летняга сонцастаяння “старыя” зёлкі абавязкова спальвалі на вогнішчы, што падкрэслівала іх звышнатуральны статус (агонь выступае сакральнай стыхіяй, што прымае расліны назад).

Абавязковым элементам Купалля на Падзвінні, як і паўсюль на Беларусі, было пляценне вянкоў дзяўчатамі. Моладзь збіралася невялікімі групамі і ішла ў поле за кветкамі. На Дубровеншчыне расліны

polotsk.su

для вянкоў збіралі з розных палёў, якія адносіліся да суседніх вёсак. Згодна павер'ю такім чынам можна было заманіць адтуль да сябе жаніхоў. Пры гэтым "стараліся, каб хлопцы з чужых дзеравень да нас прыходзілі гуляць" [19, с. 151].

Акрамя такіх агульнавядомых і шырокавыкарыстоўваемых кветак як *васількі, рамонкі і дзьмухаўцы*, найбольш папулярнымі раслінамі для пляцення вянкоў на Падзвінні былі *чабор, брат-сястра, плакун-трава, быльнёг (палын)* і інш., якія мелі ярка выражаную апатрапейную функцыю. Прымячальна, што некаторыя з вышэй пералічаных раслін з'яўляюцца рудэральнымі – г.зн. растуць на памежжы каля дарог і валодаюць спецыфічнымі абарончымі прыстасаваннямі або якасцямі (наяўнасць шыпоў, атрутных рэчываў і г.д.) Падобны характар раслін відавочна ўказвае на іх прыналежнасць да сферы іншасвету, што добра суадносіцца з традыцыйнымі ўяўленнямі пра актыўнасць нячыстай сілы ў "шалёную ноч" на Купалле: "Ды як у дзярэўні, дык гавораць: "шалёная ноч будзець" [20, л. 49].

Варажба сярод моладзі на Купалле з даўніх часоў з'яўлялася неад'емнай часткай купальскай абраднасці на ўсёй тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Падзвінні. Варажылі на Падзвінні або да захаду сонца перад Купаллем, або раніцай да ўсходу на Яна [8, с. 150]. Мэтай варожбаў было прадказанне лёсу ў межах бягучага года, і фактычна яна адлюстроўвала самыя важныя пытанні (засноўвалася на апазіцыях "шлюб/замужжа – адзінота", "жыццё – смерць" і г.д.) Кожная дзяўчына завівала некалькі вянкоў на патэнцыйных прэтэндэнтаў на яе руку і сэрца, у асобных выпадках колькасць вянкоў даходзіла да 24: "Мае сёстры плялі дванаццаць вянкоў, некаторыя дваццаць чатыры…" [8, с. 150]. Шырока-распаўсюджаным з'яўляўся звычай пускаць вянкі па вадзе, назіраючы за імі: калі вянок не патануў – гэта абяцала дзяўчыне шчаслівую будучыню ў пары і г.д.: "Была такая сажалка бальшая, дык абступім гэтую сажалку і варожым – ці пойдзеш маладзейшая, старэйшая? А ці выйду я замуж? Ну вот глядзелі куды плывець – адзін такі вянок, другі такі, ці сойдуць уместа, па вадзе плаваюць…" [21, л. 69]. У Шаркаўшчынскім раёне дзяўчаты ўпрыгожвалі вянкамі лодкі, каталіся на іх, кідалі з галавы вянок на таго хлопца, за якога жадалі выйсці замуж. На Верхнядзвіншчыне дзяўчаты адзявалі на галаву адразу два вянкі – "свой і другі – на якога парня загадваюць – два вянкі адзенуць на галаву і ідуць к пруду, ні сь кем не разгаварвая" [8, с. 150–151]. Сімволіка паэтычнга абраду пускання вянкоў, як своеасаблівай гатоўнасці пераходу моладзі з аднаго статуса ў іншы, была сугучна з агульнакупальскай сімволікай адраджэння.

Матывы варожбаў дзяўчат заставаліся нязменнымі – на шлюб, на будучы лёс і г.д. Вядомай была варажба з дапамогай *трыпутніка*, ліст якога апоўначы зрывалі ля дарогі і тройчы паўтаралі: "Трыпутнік, трыпутнік // Ты сядзіш пры дарозе // Ты бачыш старога, малога, // Ці бачыў майго мілога?" [7, с. 157]. Сарваны ліст клалі пад падушку, і па павер'ях, ноччу павінен быў прысніцца суджаны. У в. Гарбачэва Расонскага раёна дзяўчаты збіралі 12 розных траў і клалі пад падушку з прыгаворам: "Сужаны-ражаны, прыхадзі вянок плясці" [8, с. 151]. Звычай плясці вянкі з 12 траў таксама сустракаўся на Полаччыне і Лёзненшчыне. Варажылі і на зёлках – сабраныя расліны таксама ўторкалі ў сцяну хаты, прадказваючы замужжа: "Прынасілі, торкалі ў хаце перад Купалам. А тады каторая, эта самая, дзеўка як распусціцца (кветка) – замуж скора пойдзець" [10, л. 50]. Сустракаліся падобныя матывы пры варожбах на будучыню: "Вот іх прынясеш і ўставіш – раньшэ ў старых дамах неклеена было, дык у шчэлку ўставіш. Ну і замеціш – вось гэта мая, гэта маміна, гэта папіна – і каторая самая бодрая. Шчыталась, што еслі цвяты завянуць, значыць недолга жыць" (Полацкі раён)[1, с. 5].

Элементы расліннага культу купальскай абраднасці знайшлі сваё адлюстраванне ў народных вераваннях пра *папараць-кветку* і на Падзвінні: "Ён (папараць – *аўт.*) цвіце адну ноч, эта нада пры-гледзіць прастаяць" [1, с. 9]. Па павер'ях, міфічная кветка ахоўвалася нячыстай сілай, і знайсці яе лічы-лася справай вельмі складанай, нягледзячы на шматлікія спробы: "Хадзілі папараць-кветку шукалі, нас тры дзеўкі было ў доме. Ну і пайдзём у лес, вечар ужо цямнеіцца, а радам наш лес. Ну кажам, пайдзем пашукаем, няўжо праўда ёсць гэтая папараць-кветка, ну ніколі не найшлі, колькі раз хадзілі" [10, л. 36].

**Восеньскі цыкл.** У межах восеньскага цыклу каляндарнай абраднасці традыцыйныя павер'і беларусаў аб дзікарослых раслінах абумоўлівася прыроднымі ўмовамі, што складваліся прыдатна для збору спелых ягад і пладоў. Адпаведна, восеньскі народны каляндар характарызуецца наяўнасцю сістэмы ўяўленняў аб дзікарослых пладовых дрэвах. Шэраг павер'яў звязваўся са святам *Іаана Хрысціцеля*, што на Падзвінні насіла назву *Івана Галаварэза*. У гэты дзень катэгарычна забаранялася есці плады круглай формы, якая нагадвала галаву. У Шаркаўшчынскім раёне ў гэты дзень хадзілі па журавіны, якія лічыліся выдатным сродкам ад галаўнога болю – "ня будзе галава балець, як паясі" [8, с. 199]. Сімвалічнай з'яўляецца прадпісванне падобных лекавых уласцівасцей ягадам менавіта на Івана Галаварэза.

Паводле народных ўяўленняў беларусаў Падзвіння паміж святамі *Вялікай і Малой Прачыстай (Нараджэннем Прасвятой Багародзіцы)* павінна адбыцца "*Рабінавая ноч*", у якую бывае небяспечная навальніца і грымоты з дажджом. Відавочна прасочваецца этымалогія назвы "*Рабінавая ноч*" з павер'ямі пра рабіну. У народзе лічылася, што пасля гэтай ночы рабінавыя ягады паспяваюць да канца, у адваротным выпадку прадказвалі непагадзь на доўгі час. На Міёршчыне па рабіне прадказвалі, якой будзе восень: "Як рабіны многа – дажджлівая восень будзець"[8, с. 201].

polotsk.su

**Вывады**. Даследаванне паказала, што дзікарослыя расліны шырока выкарытоўваліся ў каляндарнай абраднасці беларусаў Падзвіння ў канцы XIX – пачатку XX ст., а традыцыйныя ўяўленні аб іх маюць праекцыю ў сучаснай калектыўнай памяці.

У кантэксце агульнабеларускай традыцыі асноўным рытуальным дрэвам у зімовым календары на Падзвінні выступала яліна, якая ў абраднасці надзялялася пазітыўнай сімволікай і выконвала апатрапейную і медыятыўную функцыі. Для народных уяўленняў на Падзвінні пра расліны ў вясновым цыкле каляндара характэрна наяўнасць спецыфічных рыс, якія не былі вядомы ў іншых рэгіёнах. На Вербніцу вярба, як асноўнае абрадавае дрэва, выкарыстоўвалася ў спалучэнні з *ядлоўцам*, што можа быць абумоўлена рэгіянальнымі прыроднымі ўмовамі і спецыфікай мясцовай флоры, дзе ядловец меў шырокае распаўсюджанне. У вербных прыгаворах выдзяляліся асобныя яе віды па знешняй прыкмеце (“белая”, “чырвоная”, “сіняя” і г.д.). На Вербніцу ў асобных раёнах Падзвіння сустракаецца спецыфічная традыцыя рытуальнага наведвання могілак і сцябанне іх вярбой. Вярба побач з *ядлоўцам, бярозай і асінавым дрэвам* выкарыстоўвалася і ў абрадзе “запасвання” на св. Юр’я. Характэрнай рысай рэгіёну з’яўляецца і выкарыстанне вярбы (уторкванне галінак у ніву) у абрадах земляробчага цыклу з прадуцыравальнай і апатрапейнай мэтай. Шэраг абрадавых дзеянняў з вярбой на св. Юр’я на Падзвінні мае выразнае падабенства з аналагічнымі дзеяннямі на Гродзеншчыне і Берасцейшчыне. У траецкай абраднасці спецыфіка рэгіёна праяўляецца ў выкарыстанні *бярозы* як галоўнага рытуальнага дрэва ў паўночных і заходніх раёнах Падзвіння, а ў паўднёва-ўсходняй частцы – таксама *дубу, клёну, ліпы, рабіны*. Спецыфічнай для Падзвіння з’яўляецца традыцыя фарбавання яек на Траецкія Дзяды *бярозавым лісцем*.

У летнім каляндарным цыкле народныя ўяўленні аб дзікарослых раслінах былі сканцэнтраваны ў межах купальскай абраднасці ў кантэксце агульнабеларускай традыцыі, для якой характэрны культ расліннасці. У рэгіёне шырока выкарыстоўваліся жыхарамі рудэральныя расліны (*крапіва, дзядоўнік*) з выразнай апатрапейнай функцыяй. Для Падзвіння характэрны лакальныя варыяцыі назваў адных і тых жа раслін у розных мясцовасцях. Унікальным з’яўляецца абрад абыходу вёсак з “купальняй” на Верхнядзвіншчыне. Традыцыйныя ўяўленні пра расліны ў восеньскім цыкле каляндара базіраваліся вакол пладовых дрэваў, бо прыпадалі на час збору ягад і пладоў (журавіны, рабіны і г.д.)

ЛІТАРАТУРА

1. Архив Института искусствоведения, этнографии и фольклора им. К.Крапивы (АИИЭФ). – Ф. 6. Оп. 14. Д. 214
2. Малоха, М. Елка / М. Малоха, С. Санько // Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўнік. – Мінск : Беларусь, 2004. – С. 159–160.
3. Швед, І.А. Раслінныя сімвалы беларускага фальклору : манагр. / І.А. Швед. – Брэст : Выд-ва Брэст. дзярж. ун-та, 2000. – 159 с.
4. Добровольский, В.Н. Смоленский этнографический сборник / В.Н. Добровольский. – М.: Тип. А.В. Васильева, 1903. – Ч. IV. – 720 с.
5. Никифоровский, Н.Я. Освященные предметы и отношение к ним простонародья Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Типо-Литограф. насл. М.Б. Неймана, 1903. – 26 с.
6. Рахно, К.Ю. Обереговые функции освящённой вербы / К.Ю. Рахно // SALIX SONORA, Ин-т славяноведения РАН, 2011. – С. 305–319.
7. Малоха, М. Вярба / М. Малоха, Л. Салавей // Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўнік. – Мінск : Беларусь, 2004. – С. 106.
8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал.: Т.Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Бел. Навука, 2001–2011. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне / Т.Б.Варфаламеева [і інш.]. – 2004. – 910 с.
9. Архіў гісторыка-філалагічнага факультэта Полацкага Дзяржаўнага Універсітэта (далей – АГФФПДУ). – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 2. Сш. 1.
10. АГФФПДУ. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 5.
11. Аўсейчык, У.Я. Памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння ў веснавы перыяд (па этнаграфічных матэрыялах XIX – пачатку XXI стагоддзя) / У.Я. Аўсейчык // Вест. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2014. – № 9. – С. 46–55.
12. Плотникова, А.А. Первый выгон скота в Полесье / А.А. Плотникова // Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изучение Полесья. – М. : Индрик, 1995. – С. 108–142.
13. Крачковский, Ю. Быт западно-русского селянина / Ю. Крачковский. – Полоцк, 1872. – 212 с.
14. Беларусы / І.У. Чаквін [і інш.] ; рэдкал. І.У. Чаквін / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Бел. Навука, 2007. – Т 10. Славянскія этнакультурныя традыцыі. – 514 с.
15. Нясвіжскага краю напеў векавы: народная духоўная культура Нясвіжчыны / пад. агул. рэд. В.С. Новак. – Нясвіж : Нясвіжская ўзбуйненная друкарня імя С. Буднага, 2012. – 272 с.
16. АГФФПДУ – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 1.
17. Беларусы / Г.А. Барташэвіч [і інш.] ; рэдкал. В.М. Бялявіна [і інш.] / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск: Бел. Навука, 2004. – Т 7. Вусная паэтычная творчасць. – 586 с.

18. Полацкі этнаграфічны зборнік / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 1. – 148 с.
19. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных / У.М. Сысоў. – Мінск : Выш. школа, 1997. – 415 с.
20. АГФФПДУ – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 2. Сш. 7.
21. АГФФПДУ – Ф. 1. Воп. 3. Спр.2. Сш. 3.
22. АГФФПДУ – Ф. 1. Воп. 3. Спр.2. Сш. 4.
23. АГФФПДУ – Ф. 1. Воп. 3. Спр.2. Сш. 6.
24. АГФФПДУ – Ф. 1. Воп. 3. Спр.2. Сш. 2.

**WILD PLANTS IN CALENDAR RITUALISM OF THE BELARUSIAN PEOPLE OF PODVINYE AT THE END OF XIX–XX CENTURIES**

***Y. SHAUCHENKA***

*Wild plants have been an important element of calendar ritualism since ancient times. Beliefs concerning them have been formed during centuries and found their reflection in numerous rituals and customs of the calendar. Due to diachronic sharing of knowledge they have projection in modern collective memory of the Belarusians. The article analyzes traditional views of the people of Podvinye on wild plants in calendar ritualism of the annual cycle at the end of 19th–20th centuries. On the basis of the author's field research and written sources the realization of common and local national views in rituals is characterized.*

PolotskSU